**А. М. МАКАРЭВІЧ,**
доктар філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай літаратуры
*Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова*

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ: урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V—VI класах

*Заканчэнне. Пачатак гл. у № 7 за 2013 г.*

## Шосты клас

**Другі блок: а)** урокі №№ 25—32 — раздзел «Каляндар роднай прыроды» з вучэбнага дапаможніка; **б)** урокі №№ 25—32 — паралельная падрыхтоўка вуснага сачынення-мініяцюры «на падставе ўласных назіранняў ці з апорай на творы літаратуры ці жывапісу» [8, с. 109]; **в)** урок № 33 — урок па творы для дадатковага чытання — Віталь Вольскі. «Падарожжа па краіне беларусаў» (у сувязі з тым, што далей прапануецца нязначная карэкціроўка планавання ў той частцы, што тычыцца ўрокаў па творах для дадатковага чытання і ўрокаў, на якіх выконваюцца творчыя работы, то прапанаваная ніжэй нумарацыя ўрокаў разыходзіцца з нумарацыяй у прыкладным планаванні); **г)** урок № 34 — непасрэдная падрыхтоўка да вуснага сачынення-мініяцюры.

**Другі ўрок па творы для дадатковага чытання** — характарыстыка апавяданняў цыкла «Чайкі над Нараччу» з раздзела «Падарожжа па краіне беларусаў» са зборніка выбраных твораў Віталя Вольскага «Кніга падарожжаў».

1. Падставы, на аснове якіх гэты цыкл прапаноўваецца для дадзенага ўрока.

*Па-першае*, падрыхтоўчая праца да ўрока дадатковага чытання і сам урок па гэтым цыкле Віталя Вольскага садзейнічаюць развіццю, пашырэнню вобразнага ўспрымання шасцікласнікамі з'яў прыроды, жывёльнага і птушынага свету ў кантэксце папярэдняга матэрыялу з раздзела «Каляндар прыроды». Параўнаем: **а)** «выклікаць у вучняў яркія зрокавыя і слыхавыя ўражапні ад сустрэчы з адлюстраваннем веснавой прыроды» (урок № 28 — Янка Брыль. «Над зямлёй — красавіцкае неба...»); **б)** «фарміраваць творчае ўяўленне, вобразнае ўспрыманне» школьнікаў (урок № 29 — Анатоль Вялюгін. «Спелы бор»); **в)** «далучыць вучняў да мастацкага свету пейзажнай прозы, звярнуць увагу на "фатаграфічную" дакладнасць апісання восеньскай прыроды; вучыць "бачыць" карціны навакольнага свету паводле аўтарскіх апісанняў» (урок № 30 — Іван Мележ. «Першы іней»); **г)** «дапамагчы спасцігнуць карціны, вобразы, фарбы, дэталі, апісаныя аўтарам» (урок № 32 — Іван Грамовіч. «Воблакі») [8, с. 108].

*Па-другое*, апавяданні з гэтага цыкла Віталя Вольскага разам з іншымі творамі раздзела «Каляндар прыроды» (названы вышэй) — гэта сістэмны ўзор назіранняў за прыродай, іх цікавага і нераканальнага ўзнаўлення ў літаратурнай форме. Такі ўзор назіранняў можна эфектыўна выкарыстоўваць у працэсе падрыхтоўкі шасцікласнікаў да творчай работы і выканання задання па ёй: скласці вуснае сачыненне-мініяцюру «на падставе ўласных назіранняў ці з апорай на творы літаратуры ці жывапісу» [8, с. 109].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Па-трэцяе*, некаторыя з прапанаваных для чытання апавяданняў Віталя Вольскага з адпаведнымі ў іх часткамі (напрыклад: [4, с. 261, 298—299, 300] могуць стаць для шасцікласнікаў своеасаблівым узорам стварэння менавіта мініяцюр.

2. Заданні, якія прапаноўваецца выканаць* у працэсе чытання адпаведных апавяданняў, пытанні па творах. Маюцца на ўвазе апавяданні «Залаты бераг» (апісанне «высокага берага», ураджанняў і адчуванняў апавядальніка [4, с. 261]); «Навальніца» (возера і прастора вакол яго перад навальніцай [4, с. 298], у час дажджу [4, с. 298—299], пасля навальніцы [4, с. 299]; назіранні, адчуванні, ураджанні апавядальніка як вынік успрымання ім «пад яркім сонцам возера» [4, с. 300]).

**А.** На падставе прыкмет літаратурнай формы «мініяцюра» знайсці ў прапанаваных для чытання апавяданнях часткі, якія адпавядаюць гэтым прыкметам. *(Прыкметы мініяцюры: **а)** невялікі твор (альбо частка нейкага тэксту), напісаны на падставе назіранняў, уражанняў, адчуванняў, уяўленняў, асацыяцый аўтара; **б)** кампазіцыйная завершанасць (пачатак-уступ, асноўная частка, вывад-заключэнне); **в)** сціслансць, лаканічнасць зместу — яны дасягаюцца пры дапамозе наступных сродкаў: супастаўленняў, супрацьпастаўленняў, абагульненняў, вобразных азначэнняў (эпітэтаў), параўнанняў, вобразных паралеляў у апісанні аб'ектаў і з'яў, вобразаў-асацыяцый, вобразаў-уяўленняў і інш.)*

**Б.** «Хутчэй на Нарач». Вызначыць, ад чыйго імя вядзецца апавяданне.

**В.** З якой мэтай паехаў апавядальнік на возера Нарач? Які быў яго першапачатковы намер і ці змяніўся ён потым? Калі змяніўся, то як?

**Г.** «Залаты бераг». Знайсці частку твора, у якой пацвярджаецца, што апавядальнік неаднаразова назіраў за возерам Нарач. Што давалі яму такія назіранні? Вызначыць найбольш маляўнічую частку апавядання і знайсці ў ёй вобразы, якія ствараюць слоўныя мініяцюры нарачанскіх краявідаў. *(Найбольш маляўнічая частка апавядання: «Пад нагамі сухая глеба, пакрытая кустамі ядлоўцу, верасам і чаборам. <...> Грудзі шырацца, лёгкія глыбока ўдыхаюць смалісты водар» [4, с. 261].)*

**Д.** «Шкодная ці карысная чайка?». Ахарактарызаваць паслядоўнасць расказу апавядальніка пра чаек. Якую ролю тут выконваюць пытанні, адказы на іх, а таксама прачытаныя апавядальнікам «навуковыя матэрыялы». *(Гэтае апавяданне ўяўляе сабой узнаўленне наступных фактаў: а) гутаркі апавядальніка з рыбаком Ролічам па «пытанні аб чайках», б) пацвярджэння «думкі старога рыбака» пра чаек, выказанага студэнтам Лёнем, в) вывадаў з «навуковых матэрыялаў», з якімі «праз некаторы час пасля гутаркі з Ролічам і Лёнем» пазнаёміўся апавядальнік. Пытанні і адказы на іх выконваюць ролю пераканальных сведчанняў, заснаваных на неаднаразовых назіраннях за чайкамі.)*

**Е.** «Навальніца». Знайсці ў тэксце прыклады супрацьпастаўлення прыродных з'яў. *(«То цёпла, то холадна. <...> То яно блакітнае, то цёпла-сіняе, то зялёнае, то шэрае, то сярдзітае і непрыглянае» [4, с. 297].)* Што дае такі прыём, што ён дазваляе паказаць словамі? *(Такі прыём дазваляе ствараць зрокавую карціну прыроднай з'явы.)* Знайсці прыклад супадзення (падабенства) колеру вады і настрою возера. *(Возера «то цёмна-сіняе, то зялёнае, то шэрае, сярдзітае і непрыглянае» [4, с. 297].)* Вызначыць тыя часткі апавядання, у якіх адлюстраваны надыход навальніцы, лівень над возерам Нарач, стан возера пасля дажджу. Знайсці ў іх вобразы, якія ствараюць слоўныя мініяцюры прыродных з'яў (дождж, маланка), возера ў час дажджу і пасля яго. *(**А.** «Неба тым часам зусім пацямнела, завалаклося цяжкімі і змрочнымі хмарамі. <...> За ёю бліснула другая, трэцяя». **Б.** «Дождж перайшоў у лівень. <...> Уся дарога ўздоўж берага была ўсыпана зламаным голлем». **В.** «Тым часам ярасць ветру пачала слабець. <...> Над возерам перакінула сваё каляровае каромысла радуга, але вясёлы бліскучы грыбны дождждык усё яшчэ ішоў» [4, с. 298—299].)*

**Ё.** «На касе». Знайсці ўрывак, у якім апавядальнік знаходзіцца ў цэнтры з'явы, пра якую расказвае. *(«Пад яркім сонцам у сінім небе радасна іскрыцца возера. <...> Паветра асляпляе сваёй празрыстасцю» [4, с. 300].)* Вызначыць, як ён абазначае сваю прысутнасць там. *(Апавядальнік непасрэдна абазначае сваю прысутнасць і дзеянні: «я не магу адвесці вачэй»; «уражанне такое, быццам <...>»;*

* З гэтых заданняў настаўнік можа выбраць тыя, якія найбольш падыходзяць да абранай ім формы ўрока. Заданні і пытанні да іх дастаткова шырокія. Гэта абумоўлена, апрача іншага, яшчэ і тым, што частку з гэтых заданняў, ілюстрацыі да іх можна выкарыстаць у якасці матэрыялу ў працэсе падрыхтоўкі шасцікласнікаў да выканання творчай работы: сачынення-мініяцюры.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*«мне здаецца, што я знаходжуся <...>» [4, с. 300].)* Паспрабуйце выявіць у гэтым урыўку прыкметы мініяцюры. *(Узнаўляецца адзін эпізод назіранняў апавядальніка; назіранні накіраваны на адну з'яву: возера «пад яркім сонцам у сінім небе»; адзінства настрою апавядальніка: светлы, узнёслы, узбуджаны.)* Вызначыць пры дапамозе апавядання, праз якія факты характарызуецца лад жыцця чаек. *(Адпачынак чаек, іх «вячэрняя кармёжка», начлег, гнездаванне, кладка яек, выседжванне птушанят, абарона чаек ад ворагаў — [4, с. 301—303].)* Знайсці тлумачэнне, чаму над апавядальнікам «з крыкам лятаюць чайкі». *(«Ад усіх гэтых і іншых ворагаў чайкі бараняцца сумесна. Таму яны і жывуць вялікаю грамадою. Як толькі вораг заўважаны ў паветры ці на зямлі, чайкі-суседкі накідваюцца на яго з усіх бакоў, нібы белая хмара, і праганяюць ці забіваюць на месцы» [4, с. 302].)* Узнавіць знешнія прыкметы чаек. *(«Доўгія завостраныя крылы»; «цёмна-карычневая маска на твары» ў час, калі выводзяць патомства; «чырвоная дзюба і чырвоныя ногі, белыя спіна, шыя і ніз, светла-шэрыя крылы»; «цёмныя плямкі па ўсім целе» ў «маладых чаек леташняга вывадка» [4, с. 302—303].)*

Ж. «Рыжая госцейка». Знайсці апісанне знешніх прыкмет вавёркі і ўзнавіць яе паводзіны. *(Знешнія прыкметы: «з цёмнымі кутасікамі на вушках», «пушысты хвост», «хвосцік уздоўж спіны, як пушысты пытальнік», «носік безупынна рухаецца». Паводзіны: «мітуслівa круціцца», «зацокала, замармытала нешта», «забарабаніла пярэднімі лапкамі», «спрытна паднялася, робячы кругі вакол ствала, на самы верх», «жвава і спрытна пераскаквала з галінкі на галінку», «пачала спускацца, чапляючыся за кару шырока расстаўленымі лапкамі», «раскінуўшы ў паветры лапкі і хвост, пераляцела на суседняе дрэва» [4, с. 327—328].)*

З. «Гадзюка, жаба і вожык». Вызначыць галоўную прыкмету жыцця «свету найдрабнейшых жыхароў лесу». *(Усюды актыўны рух, барацьба, пагоня за здабычай, напад і абарона, радасць існавання» [4, с. 344].)* Пацвердзіць гэта прыкладамі з тэксту, якія сведчаць пра «маленькія трагедыі» лясного жыцця. *(Паляванне гадзюкі на жабу, вожыка на гадзюку [4, с. 344—345].)* Назваць, абапіраючыся на прыклады з апавядання, «паляўнічыя прыёмы гадзюкі» і прыёмы яе самаабароны, паляўнічыя прыёмы вожыка. *(Паляўнічыя прыёмы гадзюкі: шпаркі, як маланка, выпад галавой уперад; схапіла жабу за галаву і пачала выцягваць сваю здабычу з-пад галіны; звілістымі рухамі падавалася назад; шырока можа расцягнуць свой рот [4, с. 344—345]. Прыёмы самаабароны гадзюкі: гадзюка імгненна застыла ў нерашучасці; спынілася, прыўзняўшы галаву і пазіраючы сваімі бязлітаснымі, халоднымі жоўтымі вачыма; раздвоены язычок высунуўся з рота і затрапятаўся [4, с. 345]. Паляўнічыя прыёмы вожыка: падбег лёгкім трушком да гадзюкі і адразу, з ходу, ухапіў яе за хвост; вожык засоп і скруціўся ў калючы клубок; пабег побач са змяёю, пыхкаў і фукаў, як маленькі паравоз; схапіў гадзюку за шыю каля галавы; вострымі зубкамі перакусіў ёй шыю і адгрыз галаву [4, с. 344—345].*

І. «Дзядзька Вінцук і яго буслы»*. Апісаць знешні выгляд бусла ў палёце. *(«Вялікія крылы яго шырока распасцёрты, дзюба выцягнута, чырвоныя ногі адкінуты назад» [4, с. 356].)* Вызначыць пры дапамозе прыкладаў з апавядання, у чым карысць буслоў, якія асаблівасці іх гнездавання, жыцця маладых буслоў. *(«Бусел знішчае мышэй, гадзюк, пацукоў, вусеняў, жукоў і ўсякую нечысць [4, с. 357]. Наогул, буслы гняздзяцца асобнымі парамі, далёка адна ад адной. <...> Надта ж яны ненажэрныя, асабліва бусляняты» [4, с. 358]. «З кніг мне было вядома, што бусел абзаводзіцца сям'ёй толькі на чацвёртым-пятым годзе жыцця. <...> Калі ж надыходзіць час заводзіць сям'ю, малады бусел шукае вольнага гнязда ці будуе сабе новае ў той мясцовасці, дзе ён сам з'явіўся на свет» [4, с. 358].)* Знайсці ў тэксце вывад аб тым, што прыносяць буслы людзям. *(«Калі пасяліўся бусел каля хаты, то гэта на шчасце. Так у нас лічыцца. Ды і весялей з ім» [4, с. 357].)*

К. «Думкі перад вяртаннем у горад». Вызначыць пры дапамозе вываду аўтара, у чым карысць «падарожжаў па роднаму краю», «назіранняў над прыродай». *(«<...> Падарожжы, і малыя, і вялікія, і па роднаму краю, і па іншых краінах <...> спрыяюць большаму і лепшаму разуменню жыцця народаў, іх культуры, побыту, нацыянальных асаблівасцей» [4, с. 363].)* Як разумееце выснову аўтара:

* Гэтае апавяданне, апрача іншага, можа быць цікавым і змястоўным, пераканальным, падзейна падмацаваным уступам да ўрока па творы для дадатковага чытання («Трывога ў Ельнічах» Васіля Віткі) — чацвёрты блок.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«трэба толькі вандраваць з адкрытым сэрцам і адкрытымі вачыма і ўмець бачыць» [4, с. 364]? Адказаць на пытанні пры дапамозе высноў з апавядання: як уздзейнічае прырода на чалавека, пра якую «найвышэйшую сваю ўзнагароду» гаворыць апавядальнік? (*«Прырода не толькі аднаўляе нашы сілы, але і ачышчае нас ад усяго лішняга, штучнага, непатрэбнага, што засталося ў спадчыну ад мінулага» [4, с. 364]; «Калі мне ўдасца перадаць чытачу свае ўражанні, <...> калі яго ахопіць дух вандравання і ён захоча сам папільнаваць птушак у зараснiках чароту, прыслухацца да плёску азёрнай хвалі і да крыку чаек, я палічу гэта за найвышэйшую сваю ўзнагароду» [4, с. 365].*) Ці нарадзіўся «дух вандравання» ў вас пасля знаёмства з апавяданнямі гэтага цыкла Віталя Вольскага? Абгрунтуйце ваш адказ.

**3.** Характарыстыка гэтых апавяданняў для дадатковага чытання ў адпаведнасці з прапанаванымі заданнямі і пытаннямі. Яе варта пачаць з уступнага слова настаўніка пра творчасць Віталя Вольскага. Матэрыял для такога ўступу настаўнік можа ўзяць, напрыклад, з адпаведнага раздзела вучэбнага дапаможніка «Беларуская дзіцячая літаратура» [1, с. 361—362]. Асноўны ж змест урока варта разгортваць у адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі. Апрача таго, на гэтым уроку можна прачытаць услых тыя ўрыўкі з апавяданняў, на якія арыентавалі заданні. Такім чынам дэманструюцца пераканальныя ўзоры адлюстравання аб'ектаў і з'яў прыроды ў літаратурным тэксце з праекцыяй такіх узораў на творчую работу, да якой шасцікласнікі звернуцца ў будучым.

**4.** Перспектыўная сувязь з урокам, на якім будзе здзяйсняцца творчая работа. Форма — паведамленне настаўніка: **а)** характарыстыка сутнасці сачынення-мініяцюры; **б)** вызначэнне і характарыстыка тых частак з твораў Віталя Вольскага, якія могуць быць выкарыстаны вучнямі ў працэсе падрыхтоўкі і выканання сачынення-мініяцюры «на падставе ўласных назіранняў ці з апорай на творы літаратуры ці жывапісу» [8, с. 109]; **г)** вылучэнне вучнямі пры дапамозе настаўніка тых з'яў і аб'ектаў прыроды, якія шасцікласнікі могуць адлюстраваць у сваіх сачыненнях-мініяцюрах на падставе ўласных назіранняў; **д)** вызначэнне месца назірання і формы апавядання пра яго.

**Трэці блок: а)** урокі №№ 35—41 — раздзел «Чалавек — гэта цэлы свет» з вучэбнага дапаможніка; **б)** урокі №№ 36—41 — паралельная падрыхтоўка сачынення па аповесці Кузьмы Чорнага «Насцечка»; **в)** урок № 42 — урок па творы для дадатковага чытання — аповесць «Афганская шкатулка» Андрэя Федарэнкі*; **г)** урок № 43 — творчая работа (вусная характарыстыка аднаго з герояў аповесці Кузьмы Чорнага «Насцечка»).

**Трэці ўрок па творы для дадатковага чытання** — характарыстыка аповесці Андрэя Федарэнкі «Афганская шкатулка».

**1.** Падставы, на аснове якіх гэты твор прапануецца для дадзенага ўрока.

*Па-першае*, змест аповесці гарманічна дастасоўваецца да матэрыялу папярэдніх урокаў з трэцяга блока: асаблівасцямі канфлікту ў ім, адлюстравання ўзаемаадносін дзяцей у складаных і супярэчлівых сітуацыях, раскрыцця характару герояў, яе вострасюжэтнасцю і інш. Параўнаем: **а)** «развіваць уменні школьнікаў уважліва чытаць вострасюжэтны твор, сачыць за развіццём дзеяння, <...> звяртаць увагу на спосабы абмалёўкі чалавечых характараў і выяўлення аўтарскіх адносін да герояў падзей» (урок № 35 — Алена Васілевіч. «Сябры») [8, с. 109]; **б)** звяртаць увагу вучняў «на апісанне знешняга выгляду персанажаў, іх манеру трымацца», дапамагчы «зразумець аснову канфлікту паміж героямі», вучыць «выяўляць сапраўдныя прычыны паводзін» герояў, фарміраваць уменні «сачыць за развіццём падзей, вылучаць ключавыя эпізоды, у якіх раскрываюцца характары герояў; дапамагчы зразумець значэнне ўспамінаў» дзейных асоб; «засяродзіць увагу на жанравых і мастацкіх адметнасцях твора» (урокі №№ 37—39: Кузьма Чорны. «Насцечка») [8, с. 110—111].

*Па-другое*, сюжэт аповесці «Афганская шкатулка» разгортваецца ў такім часавым, прасторавым і падзейным вымярэнні, у такой форме і прыгодніцкіх канфліктах, якія не толькі зразумелыя, а і цікавыя сучасным вучням.

* Гэтая аповесць адсутнічае ў «Прыкладным спісе твораў для дадатковага чытання», які прапанаваны ў «Вучэбнай праграме...» 2012 года. Паколькі названы вышэй «спіс» прыкладны, час ад часу мяняецца, то ў дадзеным выпадку з улікам зместу гэтай аповесці прапануем менавіта яе для вывучэння на ўроку дадатковага чытання на гэтым этапе працы ў шостым класе.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Па-трэцяе*, мастацкі матэрыял «Афганскай шкатулкі», выкананне заданняў па гэтай аповесці ў працэсе яе чытання (падбор, сістэматызацыя адпаведных літаратурных фактаў у кантэксце фарміравання вызначаных вышэй уменняў пры знаёмстве з творамі адпаведнага раздзела вучэбнага дапаможніка), сістэмная характарыстыка літаратурных герояў гэтага твора для дадатковага чытання на адным уроку садзейнічаюць, апрача іншага, выпрацоўцы ўменняў разгорнутай, цэласнай характарыстыкі літаратурнага героя. Гэта ў сваю чаргу можа стаць своеасаблівым і вельмі важным метадычным этапам падрыхтоўкі шасцікласнікаў да выканання творчай работы: «Даць вусную характарыстыку аднаго з герояў аповесці Кузьмы Чорнага “Насцечка” (апісаць знешні выгляд, паводзіны, узаемаадносіны з іншымі дзейнымі асобамі, выявіць аўтарскае стаўленне да героя і свае адносіны). Развіваць і ўдасканальваць уменне самастойна працаваць над тэкстам» [8, с. 112].

*Па-чацвёртае*, характарыстыка паводзін жывёл з чацвёртага і пятага раздзелаў аповесці можа быць адной з форм падрыхтоўкі да творчай работы з чацвёртага блока ўрокаў: стварэнне «вуснага сачынення з элементамі апісання і разважання пра свае адносіны з любой жывой істотай» [8, с. 119].

**2.** Заданні, якія прапаноўваецца выканаць у працэсе чытання аповесці (паколькі аб’ём твора вялікі, то заданні мэтазгодна даваць па раздзелах).

А. Вызначыць прыкметы прысутнасці апавядальніка ў творы. Як пра гэта гаворыцца ў тэксце? *(Апавядальнік непасрэдна сябе абазначае [7, с. 26, 28], звяртаецца да чытачоў, ацэньвае чытацкае ўспрыманне [7, с. 74].)*

Б. Ахарактарызаваць веды апавядальніка (якія яны?) пра гісторыю, яе герояў. Прывесці пацвярджэнні зробленым вызначэнням. *(Шырокія, усебаковыя; апавядальнік прапаноўвае ўзнаўленне падзей з розных бакоў: праз аповед пра падзеі мінулага ад свайго імя, ад імя Барыса Крушынскага, доктара Пратасевіча; для пацвярджэння падзей цяперашняга часу «накіроўвае» чытача ў мінулае, вызначае часавую працягласць падзей і інш. — такім чынам апавядальнік супастаўляе падзеі мінулага з розных пазіцый іх удзельнікаў.)*

В. Вызначыць на падставе «Пралога», чаму «афганец» расказаў «ягоную тайну» менавіта сябруку-беларусу. *(Зямляк наведваўся «да таварыша па няшчасці кожны вечар»; «характар меў спакойны, падатлівы»; ён клапатліва даглядаў безнадзейна хворага сябра; сваімі ўчынкамі пераканаў, што, выпісаўшыся са шпіталю, зможа годна выканаць яго просьбу [7, с. 8—9].)*

Г. Раздзел II. Даказаць пры дапамозе тэксту, што стала прычынай пропуску Цімам гола. *(«На стромкім беразе кар’ера стаяў, абапіраючыся на лыжныя палкі, высокі барадаты чалавек. <...> Усё адбылося да таго хутка, што, мабыць, толькі яны з Цімам і паспелі заўважыць барадача» [7, с. 16].)* Як Цім сам гэта тлумачыў? *(«— Дык вось, я і праўда з-за яго гол прапусціў. <...> Што ён тут, у нас, увогуле робіць?» [7, с. 18—19].)* Выявіць аўтарскія характарыстыкі Ціма і Валіка як сяброў. *(«Не, Валіку ніколі не зразумець сябра. Дужа яны розныя. Адзін любіць простае, будзённае, другі — толькі штосьці незвычайнае. Цім — гэта неба, а Валік — зямля» [7, с. 19].)*

Д. Раздзел III. Знайсці ў тэксце пацвярджэнне неспакойнага характару Ціма і разважлівасці, адданасці сяброўству Валіка. Падрыхтаваць выразнае чытанне адпаведных урыўкаў. *(«— Як у чым? <...> Я ж і прапаную гэта праверыць» [7, с. 24—25]. «Аднак жа вялікая гэта рэч — сяброўства. <...> Зрабіўшы гэта, Валік адчуў палёгку. Нават крыху і прыемна было, што ён не прэтэндуе на ролю камандзіра, а згодзен быць падначаленым» [7, с. 27—28].)*

Е. Раздзелы IV—VI. Пераказаць, як аўтар характарызуе паводзіны жывёл (ліса, зайца, сабакі). *(«Сабака, паскавытваючы, скакаў яму на грудзі. <...> Ліс знік» [7, с. 30—31]. «Сабака сустракаў яго каля хаткі радасным брэхам. <...> Цяпер трэба толькі вярнуцца на тое месца, дзе адарваўся след ліса, і яшчэ — больш давяраць сабаку» [7, с. 31]. «Словам, ніякіх падазроных пахаў і гукаў беляку не ўнюхалася. <...> У гэты самы момант і ўдарыла. Стрэл прагучаў як гром з яснага неба» [7, с. 32—33].)* Прывесці ў якасці пацвярджэння-ілюстрацыі падобных паводзін уласныя назіранні (можна ў пісьмовай форме) за свойскімі ці дзікімі жывёламі (такія назіранні могуць быць выкарыстаны ў творчай рабоце ~~на апошнім уроку развіцця маўлення~~ ў шостым класе). Знайсці ў шостым раздзеле пацвярджэнне:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што з мінулага жыцця Крушынскага стала падставай для з'яўлення ў яго адчування, «што не лес гэта шуміць, а бухае мінамёт <...>» [7, с. 36]. *(Крушынскі служыў у Афганістане: «Неяк у Афганістане, трапіўшы ў засаду (заблудзілі па ўласнай дурасці), яны, чацвёра разведчыкаў, аказаліся адрэзанымі ад сваіх. Трое сутак яны вымушаны былі пластом ляжаць на бахчавым полі, уціскаючыся тварамі ў гэтую чужую, пыльную зямлю» [7, с. 40].)*

Ё. Раздзелы VII—IX. Вызначыць, якія рысы характару Барыса Крушынскага з мінулых і рэальных падзей адлюстраваны ў той частцы сёмага раздзела, дзе паказана яго спроба «выбіць пазыку» з даўжніка — Кліента. *(Шчырасць, нерашучасць, здольнасць даравацъ даўгі, клапатлівасць, чалавечнасць [7, с. 47—48].)* Сфармуляваць меркаванне (адразу пасля чытання дзявятага раздзела), чаму Крушынскі не прызнаўся доктару Пратасевічу ў тым, што служыў у Афганістане. *(Магчымы адказ: Крушынскі нешта хаваў са свайго мінулага, не жадаў, каб яго пазналі, не хацеў нешта ўспамінаць.)*

Ж. Раздзелы X—XI. Вызначыць, што дало падставы для Вікінага прызнання Крушынскаму: «А я табе веру» [7, с. 66]. *(Магчымы адказ: клопат Крушынскага ў адносінах да Вікі. Дзяўчынка, відаць, параўнала яго з тымі людзьмі, ад якіх у апошні час бачыла толькі кепскае, — злымі гараджанамі, п'яніцам-айчымам, няўдаліцай-маці, гвалтаўніком-дальнабойшчыкам. Такое параўнанне прыняло, відаць, яе да высновы, што Барыс адрозніваецца ад гэтых людзей найперш чалавечнасцю, клапатлівасцю, справядлівасцю і інш.)* Ахарактарызаваць Барыса як чалавека на падставе падзей дзявятага раздзела; характарыстыкі падмацаваць прыкладамі з адпаведных эпізодаў. *(Магчымы адказ: разважлівы, клапатлівы, адказны за свае ўчынкі і лёс блізкіх людзей, сентыментальны, рашучы, праніклівы, загадкавы.)*

З. Раздзелы XIV—XVII. Выявіць супадзенні з мінулага жыцця Крушынскага і з жыцця «афганца Васіля», пра якога расказваў Крушынскі. *(«Мне вінаватыя многія, калі я яшчэ бізнесам займаўся... <...> — Быў, — неахвотна прызнаўся Крушынскі. — Самым сапраўдным, як у фільмах па тэлевізары паказваюць...» [7, с. 86]; «— Віка, вось што бы ты рабіла зараз, калі б, напрыклад, даведалася, што я забіваў на вайне людзей? Альбо што я сядзеў у турме? Ці што я здзейсніў злачынства, аб якім ніхто пакуль не ведае? Што бы ты рабіла?» [7, с. 88]. «Васіля наперабой завуць у розныя фірмы, абяцаюць залатыя горы. <...> Грошы шалёныя, замежныя паездкі, рэстараны, іншамаркі» [7, с. 99].)*

І. Раздзелы XVIII—XIX, XXI. Знайсці тую частку твора, якая сведчыць, што апавяданне Крушынскага пра «афганскую гісторыю» і «афганца Васіля» не раскрыла тайну Крушынскага для хлопцаў. *(«— А што, калі ён проста маніў нам? <...> Ва ўсіх на вачах?» [7, с. 103].)* Адказаць на пытанне: ці можна паверыць у тое, што Крушынскі першым сустрэчным падлеткам мог распавесці пра службовую «афганскую тайну»? Адказ падмацаваць уласнымі разважаннямі. Вызначыць тыя часткі раздзелаў, у якіх выяўляюцца рысы характару Ціма і Валіка; назваць гэтыя рысы. *(Эпізод наведвання хлопцамі «афганца» — п'яніцы Колькі Танкіста [7, с. 105] — смелыя. **Цім**. Эпізод гутаркі з Валікам адносна таго, што Крушынскі, магчыма, нахлусіў ім пра Васіля [7, с. 103] — няўрымслівы, здольны сумнявацца, не браць усё на веру. «— Табе што было сказана? — нагадаў ён. — Без патрэбы там не з'яўляцца. Толькі раз на тыдзень і толькі ўвечары, каб ніхто не бачыў» [7, с. 106] — адказны. «Але Цім быў упарты <...> разгадаў-такі тайну адзінаццацігадовай даўнасці» [7, с. 107] — упарты, настойлівы, здагадлівы. «Цім коратка пераказаў тое, што пачуў учора ад бацькі. <...> Вось у чым для мяне загадка» [7, с. 108] — здольны мысліць лагічна. «Цім схапіў Валіка за руку і пацягнуў з кухні. <...> Яны ж там могуць захоўвацца вечна» [7, с. 109] — здагадлівы, кемлівы. «Цяпер Цім адкрыўся яму зусім з іншага боку. <...> З нічога, з двух пустых эпізодаў зрабіць такія высновы» [7, с. 110] — фантазёр-летуценнік, мае аналітычны розум. «— Шкатулка з каштоўнымі камянямі — у труне <...> а помнік, што паставіў Васіль...» [7, с. 115] — здагадлівы, здольны супастаўляць факты. «— Або ён нам хлусіць <...> што галава яго забіта невядома чым, толькі не каштоўнасцямі» [7, с. 117] — разважлівы. **Валік**. «Валіка ўразіла <...> ні газет, ні тэлевізара... Усё гэта было цікава нашаму Валіку. І заманліва. Вось чаму яго цягнула ўвесь час у лясную хатку» [7, с. 106] — уражлівы, цікаўны.)*

К. Раздзелы XXVII—XXIX. Вызначыць дэтэктыўныя прыкметы ў гэтых раздзелах.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*(Імкненне Вікі і хлопцаў раскрыць загадкавае злачынства, сваімі справамі дабіцца справядлівасці ў адносінах да Крушынскага; галоўная задача пры гэтым — выратаванне невінаватага [7, с. 144]; аналіз імі фактаў мінулага [7, с. 143]; сведчанні Вікі на карысць Крушынскага [7, с. 143]; гіпотэза Вікі: «яго зробяць вінаватым» [7, с. 143]; сведчанні-ўспаміны, супастаўленні Вікі [7, с. 146]; вобыск у кішэнях курткі Крушынскага; знаходка ў патаемнай кішэні скамечанага пачку ад цыгарэт і выхад з дапамогай запісанага на ім нумара тэлефона на вадзіцеля Стася [7, с. 146]; гіпотэзы Ціма адносна мужчыны, што прыязджаў ў сяло і бадзяўся на могілках [7, с. 147]; гіпотэзы Вікі адносна доктара [7, с. 147—148]; супастаўленне гэтых гіпотэз, звязванне іх у лагічны ланцуг узаемасувязей [7, с. 148]; сустрэчы з мэтай расследавання з вадзіцелем Стасем [7, с. 149—150], доктарам Пратасевічам, яго зяцем [7, с. 151]; заява ў міліцыі з падсумаваннем назбіраных фактаў [7, с. 152]; вобыск у хаце доктара [7, с. 154].)*

Л. Раздзелы XXX — Энілог. Пацвердзіць выснову Крушынскага пра тое, што каштоўнасці са шкатулкі «не прыносяць шчасця» яму, што яны «праклятыя», ён не можа «траціць іх на сябе», а яны «не адпускаюць» яго. *(«— Так, гэта не мае каштоўнасці. <...> — Яшчэ і як спрабаваў. Але ўсё ператваралася толькі ў шкоду мне» [7, с. 157].)* Вызначыць, чаму «грошы слухаліся», калі Крушынскі іх выдаткоўваў бацькам «афганца», Віцы, яе маці. *(«Можа, закляцце з гэтых каштоўнасцей здымаецца менавіта так: <...> хто мае ў іх сапраўдную патрэбу... <...> Здавалася б, жыві не хачу. <...> Горш не прыдумаеш!» [7, с. 158].)* Вызначыць пры дапамозе твора, што — галоўным чынам — не «адпускае» Крушынскага з Вялікай Паляны. *(«— Паеду, — сказаў ён. <...> Калі-небудзь...» [7, с. 161].)*

М. Індывідуальныя заданні для найбольш здольных вучняў (мэта такіх заданняў: паралельная «метадалагічная» падрыхтоўка шасцікласнікаў да характарыстыкі вобразаў з аповесці Кузьмы Чорнага «Насцечка» — творчая работа па трэцім блоку). Сутнасць індывідуальных заданняў: падрыхтаваць невялікія паведамленні: мае ўражанні ад любімага вобраза твора (на выбар — Барыса Крушынскага, Вікі, Ціма, Валіка) і адносіны да яго.

3. Характарыстыка аповесці на ўроку па творы для дадатковага чытання ў адпаведнасці з прапанаванымі заданнямі і пытаннямі. Яе варта пачаць з уступнага слова настаўніка пра гісторыю вайны ў Афганістане, пра тое, што яна знайшла сваё адлюстраванне ў літаратуры, кінематографе. Асноўны ж змест урока мэтазгодна разгортваць у адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі. Да таго ж варта на гэтым уроку прачытаць услых тыя ўрыўкі з твора, на якія арыентавалі заданні. Такім чынам можна здзяйсняць паралельную падрыхтоўку вучняў у адпаведнасці з мэтамі творчых работ з трэцяга і чацвёртага блокаў.

4. Перспектыўная сувязь з творчымі работамі з трэцяга і чацвёртага блокаў. Форма — паведамленне настаўніка: а) кароткая характарыстыка сутнасці будучых творчых работ; б) вылучэнне тых частак з праведзенага разгляду аповесці, якія даюць вучням узоры стварэння літаратурнай характарыстыкі вобразаў людзей і жывёл.

**Чацвёрты блок:** а) урок № 55 — урок па творы для дадатковага чытання — апавяданне Васіля Віткі «Трывога ў Ельнічах»; б) урокі №№ 56—63 — раздзел «Зямля мая — зялёны дом» з вучэбнага дапаможніка; в) урокі №№ 56—63 — паралельная падрыхтоўка «вуснага сачынення з элементамі апісання і разважання пра свае адносіны з любой жывой істотай» [8, с. 119 ]; г) урок № 64 — творчая работа — непасрэдная падрыхтоўка вуснага сачынення.

**Чацвёрты ўрок па творы для дадатковага чытання** — характарыстыка апавядання Васіля Віткі «Трывога ў Ельнічах».

1. Падставы, на аснове якіх гэты твор выбраны для дадзенага ўрока.

*Па-першае*, ён можа стаць шчымлівым, пераканальным уступам да раздзела «Зямля мая — зялёны дом». У якасці эпіграфаў да ўрока па гэтым творы для дадатковага чытання можна выкарыстаць наступныя радкі з верша П. Панчанкі «Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае...» (гэты твор будзе вывучацца ў дадзеным блоку): «З драздом і удодам, заранкай і пліскаю // Святлей, чалавечней нам жыць і любіць»; «Хто птушку пакрыўдзіць — Той сам сабе здрадзіць» [2, с. 280]. Гэтыя эпіграфы могуць быць таксама і эстэтычнымі гіпотэзамі, якія вучні пры дапамозе настаўніка дакажуць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на дадзеным і наступных уроках. Апрача таго, яны спрыяюць высвятленню ідэйнага зместу апавядання «Трывога ў Ельнічах». Ва ўступе да гэтага ўрока настаўнік можа звярнуцца да фактаў з апавядання Віталя Вольскага «Дзядзька Вінцук і яго буслы», з якім вучні знаёміліся на другім уроку па творы для дадатковага чытання. Такім чынам выбудоўваецца структура пазнавальна-выхаваўчага працэсу ў межах розных блокаў урокаў: а) першапачатковае знаёмства з матэрыялам (яго абмеркаванне, развіццё ў разважаннях вучняў, асэнсаванне — другі блок), б) паўторнае знаёмства з матэрыялам на больш высокім эмацыянальным узроўні (абмеркаванне, асэнсаванне ў перспектыве на творчую работу вучняў — другі, чацвёрты блокі).

*Па-другое*, урок па гэтым апавяданні Васіля Віткі спрыяе далейшаму ўспрыманню шасцікласнікамі вобразаў жывёл ужо на прыкладзе твораў, вывучэнне якіх прапануецца ў гэтым раздзеле вучэбнага дапаможніка. Параўнаем: **а)** неабходнасць абараняць жывёл і клапаціцца пра іх у цяжкія перыяды жыцця («Алені» І. Пташнікава, «Багіра» Янкі Маўра); **б)** непрыняцце дзіцячай свядомасцю спажывецкіх адносін дарослых да жывёл, імкненне дзіцяці да сяброўства з жывёламі, да пазнання свету прыроды («Алені» І. Пташнікава; **в)** жывёлы, як вызначыў Янка Маўр, «зусім разумныя асобы» [2, с. 274], што могуць жыць не інстынктамі, а розумам, — яны адчуваюць, думаюць, ведаюць, мысляць, памятаюць («Стары бабёр» А. Жука), разумныя, з высакародным сэрцам, спагадлівыя, упартыя («Багіра» Янкі Маўра).

*Па-трэцяе*, пры характарыстыцы апавядання «Трывога ў Ельнічах» на ўроку па творы для дадатковага чытання можна будзе праілюстраваць асаблівасці перанясення ў мастацкім творы рыс, уласцівых чалавеку, на жывёл.

*Па-чацвёртае*, гэтае апавяданне Васіля Віткі ў сукупнасці з іншымі творамі, названымі вышэй, можа стаць пераканальным узорам для вучняў у працэсе іх падрыхтоўкі да творчай работы: вуснага сачынення «Мае адносіны з жывой істотай». Паколькі такі від творчай работы прадугледжвае зварот да элементаў апавядальнай гісторыі, то характарыстыка такіх элементаў у «Трывозе ў Ельнічах»* дазволіць сарыентаваць вучняў на стварэнне сачынення ў форме апавядальнай гісторыі**.

**2.** Заданні, якія прапануюцца выканаць у працэсе чытання апавядання.

**А.** Вызначыць, калі, у якіх абставінах «паміж Юзікам і Толікам пачалося сяброўства».

**Б.** Выявіць эпізоды, у якіх праяўляюцца рысы характару Юзіка і Толіка, вызначыць гэтыя рысы.

**В.** Выказаць меркаванне адносна таго, ці быў у Юзіка канкрэтны намер нешта здзейсніць, калі ён «выскачыў са стрэльбай» з бацькавай хаты; як пра гэта гаворыцца ў творы.

**Г.** Адказаць на пытанні: якая рыса характару, якая думка-перакананне выклікала гнеў Юзіка ў адносінах да Толіка і буслоў; якія думкі, адчуванні з'явіліся ў Толіка да Юзіка, калі ён назіраў за сябрам пасля Юзікавага стрэлу, якія рысы характару пры гэтым праяўляюцца; што прымусіла Толіка «не бавячыся ні хвіліны, ісці на гэтыя начныя пошукі сябра».

**Д.** Выявіць, што адбывалася са «збітай з тропу душой» Юзіка пасля яго ўцёкаў з дому.

**Е.** Вызначыць, з якой мэтай Адам Парубейка з сынам Толікам «усцягнулі на таполю старое кола», чаму менавіта кола, а не нейкі іншы прадмет.

**Ё.** Пераказаць, як адносіліся буслы да людзей, свойскіх птушак пасля іх пасялення на таполі.

**Ж.** Даказаць на прыкладах з тэксту, што ў пэўных сітуацыях буслы паводзілі сябе, як людзі. Якімі словамі гэта асабліва падкрэсліваецца?

**3.** Выказаць меркаванне адносна наступнага факта: увечары «з гнязда скінулася двое буслянят» (пры гэтым звярнуць увагу, што магло быць сапраўднай прычынай яшчэ адной трагедыі ў буслінай сям'і; адзначыць, ці

---

* Наяўнасць апавядальніка; у той жа час яго прысутнасць у апавяданні мінімальная; падзеі ўзнаўляюцца так, нібыта яны адбываюцца ўпершыню.

** На гэтым этапе арганізацыі дзейнасці шасцікласнікаў па сістэме перспектыўных ліній варта звярнуць увагу, што набытыя вучнямі ўменні адлюстроўваць падзеі, за якімі яны назіралі, спатрэбяцца ім у будучым пры падрыхтоўцы ў сёмым класе вуснага апавядання ў кантэксце ўспрымання і характарыстыкі твора для дадатковага чытання: апавесці У. Караткевіча «Сівая легенда».

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

можна ў такім выпадку пагадзіцца з думкай апавядальніка: «хутчэй за ўсё <...>»).

І. Растлумачыць магчымую прычыну таго, што бусляняты «дзюблікамі пачалі скубці за рукавы» Толіка, калі той іх «накарміў пшоннаю кашаю».

К. Адказаць на пытанні: які «цяжкі дакор» мела на ўвазе Патрубейчыха, сказаўшы пра яго Яўстрата, калі той «у задзірванелай вулічнай абочыне стаў капаць яму», каб пахаваць бусла; якімі былі вочы бусліхі, што назірала за Юзікам на тым «месцы, дзе Яўстрат пахаваў бусла».

Л. Выказаць меркаванне: якія адчуванні бусліхі не агучаны ў наступнай частцы твора. «— Так яна [бусліха] там і прастаяла ўсю ноч? — Усю ноч, — вінавата ўнурыўся Юзік» [3, с. 172].

**3.** Падрыхтоўка настаўнікам невялікага тлумачальнага слоўніка да апавядання. Гэта выклікана тым, што ў творы ёсць шмат слоў і выразаў, сэнс якіх вучням можа быць незразумелы. Тлумачэнні, прыведзеныя ў такім слоўніку, спрыяюць, апрача іншага, развіццю вобразнага ўяўлення шасцікласнікаў, выкарыстанню ў іх маўленні ёмкіх, трапных, сэнсава насычаных слоў і выразаў. Да іх ліку можна аднесці наступныя: (Юзік) *крутасвет*; узяць *патолю*; вока не спускай з гэтага *вісуса*; (Яўстрат) *далікаціцца*; *перапрошваць* (за сына); *раскупчасціліся атожылкамі* з шырокімі *лапушнымі* лістамі; *атайбавалася* жыць; хапаўся *загрудкі*; школьны *дзядзінец*; *раз'ятраны* Юзік; *лабок* хаты; *шаленец*; *вунянё* стаіць *ля падваротні*; такому *шыбеніку*, як іх сын; ад такога *немаладу* якой можна бяды дачакацца; (бусляняты) *не паспелі ўвабрацца ў пер'е*; (бусляняты) *зацякліся* за цэлы дзень з голаду; ліхтар «*лятучая мыш*»; адкінуў *веснічкі* і *разораю падаўся* ў канец агарода; *збітая з тропу* душа; бясклапотна *знябыцца*; *выбіваўся* досвітак. У тым выпадку, калі па нейкіх прычынах настаўнік не прымае такую параду адносна тлумачальнага слоўніка, то варта на ўроку па гэтым творы для дадатковага чытання выдзеліць час для тлумачэння незразумелых для вучняў слоў і выразаў.

**4.** Характарыстыка апавядання на ўроку па творы для дадатковага чытання ў адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі і пытаннямі.

**5.** Апрача іншага, варта на гэтым уроку прачытаць уголас тыя ўрыўкі з твора, у якіх гаворыцца пра шчаслівую буслінаю сям'ю, «адчай і роспач» «цэлай чарады буслоў, што дазналася пра няшчасце» [3, с. 169], пра самотнае гора адзінокай бусліхі. Такім чынам на вобразным і эмацыянальным узроўнях можна прадэманстраваць вучням адзін з узораў пераканальнага адлюстравання вобразаў птушак у літаратурным тэксце з праекцыяй такога ўзору на творчую работу, да выканання якой шасцікласнікі звернуцца ў далейшым, — «Мае адносіны з жывой істотай».

**6.** Перспектыўная сувязь з творчай работай. Форма — паведамленне настаўніка: **а)** характарыстыка сутнасці творчай работы па выніках вывучэння наступнага раздзела; **б)** вызначэнне і характарыстыка падрыхтоўчых этапаў і форм працы па творчай рабоце; **г)** характарыстыка асаблівасцей раскрыцця ў мастацкім творы прадстаўнікоў птушынага свету; **д)** вызначэнне жанравых асаблівасцей твора (апавядальная гісторыя) з праекцыяй іх на падрыхтоўку шасцікласнікамі творчай работы.

Такім чынам, вызначаныя вышэй этапы і формы працы па сістэме перспектыўных ліній спрыяюць фарміраванню ўменняў вобразных выказванняў, прыўнясенню ў іх суб'ектыўна-ацэначных элементаў на падставе ўспрымання мастацкіх твораў і суаднясення іх вобразаў з аб'ектамі і з'явамі рэчаіснасці.

**Заключэнне.** Прапанаваныя ў артыкуле этапы і формы працы па сістэме перспектыўных ліній спрыяюць падрыхтоўцы разгорнутай, доказнай характарыстыкі мастацкіх твораў на ўроках па творах для дадатковага чытання, а таксама паступоваму назапашванню неабходных ведаў і ўменняў для выканання творчых работ. Усё адзначанае садзейнічае фарміраванню ўменняў і навыкаў рацыянальнай арганізацыі працы (самастойнай і на ўроках) пяцікласнікаў і шасцікласнікаў. Такія «метадалагічныя» назапашванні (пры ўмове іх сістэматычнага замацавання і развіцця) дазволяць вучням на далейшых этапах навучання (VII—IX класы) у працэсе чытання мастацкіх твораў ужо самастойна рабіць некаторыя паралельныя назапашванні на адпаведную навучальную перспектыву: рыхтаваць доказныя характарыстыкі, ацэнкі твораў, іх літаратурных вобразаў, падбіраць матэрыял і эфектыўна яго выкарыстоўваць у творчых работах.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Спіс літаратуры


1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. — Мінск : Вышэйш. шк., 2008. — С. 361—362.

2. *Бельскі, А. І.* Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. — Мінск : Нац. ін-т адук., 2010. — 320 с.

3. *Вітка, В.* Трывога ў Ельнічах / В. Вітка // Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / аўт.-уклад. М. Ф. Шаўлоўская. — Мінск : ТАА «Юніпрэс», 2003. — С. 165—172.

4. *Вольскі, В.* Кніга падарожжаў : выбр. / В. Вольскі. — Мінск : Беларусь, 1971. — С. 260—365.

5. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V—XI класы / зацв. Мін-вам адук. Рэсп. Беларусь. — Мінск : Нац. ін-т адук., 2012. — 127 с.

6. *Рублеўская, Л.* Янук, рыцар Мятлушкі / Л. Рублеўская // Сучасная беларуская драматургія : традыцыі і наватарства / уклад., прадм. П. Васючэнкі. — Мінск : Сэр-Віт, 2003. — С. 575—587.

7. *Федарэнка, А.* Афганская шкатулка : аповесць, апавяданні / А. Федарэнка. — Мінск : Юнацтва, 2002. — 221 с.

8. *Язерская, С. А.* Беларуская мова і літаратура. 5—6 кл.: прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / С. А. Язерская, Л. К. Цітова. — Мінск : НІА — Аверсэв, 2012. — 123 с. — Рэжым доступу: http://knihi.com/anon/Bielaruskaja_mova_i_litaratura_5-6_kl_prykladnaje_kalandarna-tematycnaje_planavannie.html. — Дата доступу: 27.05.2013.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова